CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

WYPEŁNIA ZDAJĄCY

KOD

PESEL

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

**Egzamin maturalny** ***Formuła 2023***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

**TEST DIAGNOSTYCZNY**

*Symbol arkusza*
MMBB-P0-100-2212

DATA: **14 grudnia 2022 r.**

GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**

CZAS TRWANIA: **210 minut**

LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Przed rozpoczęciem pracy z arkuszem egzaminacyjnym**

- Sprawdź, czy nauczyciel przekazał Ci **właściwy arkusz egzaminacyjny**, tj. arkusz we **właściwej formule,** z **właściwego przedmiotu** na **właściwym poziomie**.
- Jeżeli przekazano Ci **niewłaściwy** arkusz – natychmiast zgłoś to nauczycielowi. Nie rozrywaj banderol.
- Jeżeli przekazano Ci **właściwy** arkusz – rozerwij banderole po otrzymaniu takiego polecenia od nauczyciela. Zapoznaj się z instrukcją na stronie 2.

Układ graficzny
© CKE 2022

## Instrukcja dla zdającego

1. Sprawdź, czy ten arkusz egzaminacyjny zawiera 19 stron (zadania 1–17). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Na pierwszej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
3. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
4. W wyznaczonym miejscu zapisz numer tematu wybranego do realizacji.
5. Wypracowanie zapisz w miejscu na to przeznaczonym.
6. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w tabelkach przeznaczonych dla egzaminatora. Tabelki umieszczone są na marginesie przy każdym zadaniu.
8. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
9. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
10. Możesz korzystać ze słownika językowego.

**Lista lektur obowiązkowych w roku szkolnym 2022/2023 i 2023/2024**
**(zgodna z wymaganiami egzaminacyjnymi)**

**Poziom podstawowy**
Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Бібліі*
Ян Баршчэўскі, *Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях* (*Плачка*, выбраныя фрагменты)
Канстанцін Вераніцын, *Тарас на Парнасе*
Кастусь Каліноўскі, *Пісьмы з-пад шыбеніцы*; *Мужыцкая праўда № 1*
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*
Францішак Багушэвіч, *Прадмова да Дудкі беларускай*; *Калыханка,* выбраныя вершы
Змітрок Бядуля, *На каляды к сыну*; *Пяць лыжак заціркі*
Цётка, *Шануйце роднае слова*
Максім Багдановіч, *Апокрыф*; *Хто мы такія*; *Санет*, выбраныя вершы
Максім Гарэцкі, *Рускі*; *Стары прафесар*
Янка Купала, *Курган*; *Незалежнасць*, *Явар і каліна*, *Спадчына*, выбраныя вершы
Якуб Колас, *Новая зямля*, *Што яны страцілі*
Кузьма Чорны, *Макаркавых Волька*
Наталля Арсеннева, *Малітва*, выбраныя вершы
Ларыса Геніюш, *Маці мая сялянская*, выбраныя вершы
Янка Брыль, *Галя, Маці*
Ян Скрыган, *Слепата*
Іван Шамякін, *Дзеці настаўніцы*
Іван Мележ, *Людзі на балоце* (фрагмент *Сватаўства*)
Барыс Сачанка, *Чаравікі-туфелькі*, *Дарога праз лес*
Уладзімір Караткевіч, *Зямля пад белымі крыламі* (фрагмент раздзела *Зялёны шум*, фрагмент *Людзі зямлі беларускай*), *Дзікае паляванне караля Стаха* (фрагмент *Расказ легенды пра караля Стаха*); *На Беларусі Бог жыве*, выбраныя вершы
Ніл Гілевіч, *Каб людзьмі між людзей пачувацца*
Сакрат Яновіч, *Гасцінец*, *Прыгожай, Бацькаў гнеў*, *Вёха – багіня ганьбы*
Яўгенія Янішчыц, *Ты пакліч мяне. Пазаві...*, выбраныя вершы
Аляксей Дудараў, *Вечар* (фрагменты з дзеі першай)
Васіль Быкаў, *Аблава*, *Калі хочацца жыць*
Алесь Барскі, *Беластоцкі край*; *Я сын зямлі беластоцкай...*, *Селянін, як тварэц...*, выбраныя вершы
Святлана Алексіевіч, *Чарнобыльская малітва* (фрагмент *Самотны чалавечы голас*)
Барыс Пятровіч, *Спачатку была цемра* (фрагмент 1 раздзела часткі другой)
Ігар Бабкоў, *Хвілінка* (фрагмент 6-га раздзела часткі *Паветраны шар*).

**Poziom rozszerzony**
Максім Багдановіч*, За сто лет*
Максім Гарэцкі*, Фантазія*
Якуб Колас*, У палескай глушы* (фрагмент *XVI часткі)*
Янка Купала*, Тутэйшыя*
Рыгор Барадулін*, Жыццё і паэзія*
Сакрат Яновіч*, Пад знакам Арла й Пагоні* (фрагмент *30. Эліты)*
Ларыса Геніюш*, Споведзь*
Надзея Артымовіч*, Ёсць тое...,* выбраныя вершы
Алесь Разанаў*, Sumus ne simus,* выбраныя вершы
Вольга Рымша*, Рэквіем*
Уладзімір Арлоў*, Незалежнасць – гэта...*
Барыс Пятровіч*, Трызненні* (фрагмент *Шчасце быць – 1).*

**Inne lektury obowiązkowe zamieszczone w *Informatorze o egzaminie maturalnym z języka białoruskiego jako języka mniejszości narodowej od roku szkolnego 2022/2023*, do których również można się odwołać**

**Poziom podstawowy**
Максім Танк, *Рукі маці*, выбраныя вершы
Віктар Швед, *Беласточчына*, выбраныя вершы
Уладзімір Някляеў, *Праводзіла з дому*, выбраныя вершы
Віктар Шніп, *Жыццё, нібыта нітка Арыядны...*, выбраныя вершы.

## Część 1. Test językowy

Przeczytaj uważnie tekst, a następnie wykonaj zadania umieszczone pod nim. Odpowiadaj **tylko na podstawie tekstu** i tylko **własnymi słowami** – chyba że w zadaniu polecono inaczej. Udzielaj tylu odpowiedzi, o ile Cię poproszono. Odpowiedzi udzielaj w języku białoruskim.

Паліна Доля

***Пра кніжных чарвякоў: літаральна і фігуральна***

Вы сабралі вялікую хатнюю бібліятэку, аддаяце ў кнігарнях неймаверныя сумы, не высыпаецеся, таму што кожны вечар абяцаеце сабе “прачытаць толькі адну главу і адразу спаць”? Верагодна, вы – самы сапраўдны кніжны чарвяк. У сваім жаданні паглынаць старонку за старонкай вы няўмольны і відавочна гэтага не саромеецеся. Цяпер зусім не сорамна называць сябе кніжным чарвяком, ці не так? А адкуль наогул узяўся гэты выраз? Падрыхтуйцеся: усё не так проста, як падаецца на першы погляд. [...]

У многіх мовах выраз “кніжны чарвяк” застаецца нязменным – узяць той жа bookworm у англійскай або pustakaala purugu ў тэлугу[1]. Але ёсць варыянты і больш цікавыя. Да прыкладу, французы выкарыстоўваюць buveur d'encre – “які п’е чарніла”. Немцы б назвалі вас “пацуком, што чытае”, румыны – “бібліятэчнай мышкай”, а ў Інданезіі вас бы ахрысцілі “кніжнай блыхой”. Ва ўсіх гэтых выразах ёсць сёе-тое агульнае. Яны нібы кажуць: вы – галодны звер, словы на старонках – ваша ежа і голад ваш неспатольны. Першае задакументаванае згадванне фразы “кніжны чарвяк” адносіцца да 1580 года. У перапісцы паміж навукоўцам Габрыэлем Харві і Эдмундам Спенсерам горача абмяркоўваўся іх агульны знаёмы, пра якога пішуць наступнае: “Па раніцах ён кніжны чарвяк, пасля абеду – соладавы”. [...]

Англійскі драматург Бен Джонсан у сваёй п’есе “Забавы”, апублікаванай у 1600 годзе, таксама выкарыстаў выраз “кніжны чарвяк” – зноў у трохі негатыўным кантэксце. “Беднае сэрца, скажонае і сапсаванае блудным кніжным чарвяком, марнатраўцам свечак” – не надта падобна на камплімент. Так ці інакш, да 1600-га гэты выраз ужо трывала ўвайшоў у паўсядзённую гаворку, хоць і нёс адмоўны характар. Кніжных чарвякоў заадно называлі [...] і марнатраўцамі свечак – колькі іх ішло на чытанне па вечарах! Да станоўчага ўспрымання, вядома, яшчэ далёка.

Першая згадка пра кніжнага чарвяка як нібыта існуючага насякомага адносіцца толькі да 1654 года: Рычард Уітлак піша пра тое, што гэтыя істоты – неверагодныя доўгажыхары, а іх развіццё закранае мноства мінулых эпох. Дык што ж было раней, чытач або чарвяк? Хутчэй за ўсё, насякомае. Нягледзячы на тое, што раней тэрмін “кніжны чарвяк” не выкарыстоўваўся для іх апісання, усё ж згадкі пра істоты, якія праядаюць старонкі, з’яўляюцца куды раней. Яшчэ Арыстоцель у сваёй “Гісторыі жывёл” піша пра маленькіх скарпіёнаў без хваста, якія псуюць скруткі. Паэт Эвенус Пароскі ў V стагоддзі нават напісаў эпіграму, у якой выказаў усю сваю незадаволенасць “пажыральнікамі старонак”. Адным словам, кандыдатаў на званне першага кніжнага чарвяка ад свету насякомых так шмат, што складана сказаць напэўна. [...]

[1] Тэлугу – адна з афіцыйных моў Індыі.

Такім чынам, чалавецтва стала на шлях барацьбы з кніжнымі чарвякамі. Але як пазбавіцца ад таго, што так складана заўважыць няўзброеным вокам? Метады былі вельмі своеасаблівыя. Вітрувій у сваёй кнізе “Архітэктура” рэкамендаваў ставіць кнігі, паварочваючы ва ўсходні бок, таму што “кнігі, павернутыя на поўдзень і захад, пашкоджваюцца чарвякамі і сырасцю”. Бібліятэкар Херэфордскага сабора лічыў, што яго клопат абараніць кнігі ад благога ўздзеяння, а таму кожны дзень праціраў іх, вытрасаў і пазбаўляўся нават ад намёку на пыл. [...] А яшчэ бібліятэкары спрабавалі трымаць кнігі ў холадзе, на стальных паліцах замест драўляных, апырскваць усё інсектыцыдамі і часцей праветрываць. Некаторыя прамочванні ад кніжных чарвякоў былі настолькі таксічнымі, што наносілі шкоду не толькі насякомым, але і няўдачлівым чытачам. [...]

Калі [...] хатняя бібліятэка гнецца ад старадаўніх кніг, абавязкова праверце іх на наяўнасць няпрошаных гасцей – можа, кніжныя вошы ўжо з’елі ўвесь клейстар і падбіраюцца да вашых любімых асобнікаў. Урэшце, у кватэры павінен застацца толькі адзін кніжны чарвяк – і гэта вы.

www.nlb.by

1. 0–1–2

**Заданне 1. (0–2)**

**Выберы рысы, характэрныя для тэксту Паліны Долі. Пазнач ТАК, калі дадзеная рыса выступае ў гэтым тэксце, і НЕ – калі не выступае.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Падкрэслена аб’ектыўны характар выкладання думак. | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Шырокае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі. | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Наяўнасць эмацыйна-экспрэсіўнай лексікі. | **ТАК** | **НЕ** |

2. 0–1

**Заданне 2. (0–1)**

**Ці на кожнае пытанне з табліцы можна знайсці адказ у другім абзацы тэксту? Пазнач ТАК, калі можна адшукаць адказ, альбо НЕ – калі нельга.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Як у розных мовах перадаецца сэнс паняцця “кніжны чарвяк”? | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | З якой мовы паходзіць назва “кніжны чарвяк”? | **ТАК** | **НЕ** |

3. 0–1

**Заданне 3. (0–1)**

**Тлумачальны слоўнік беларускай мовы для слова *ахрысціць* падае тры значэнні. З якім з іх суадносіцца гэтае слова ў другім абзацы? Пазнач правільны адказ сярод А–В.**

**А.** Выканаць абрад хрышчэння над кім-небудзь.
**Б.** Перажагнаць каго-небудзь, што-небудзь, зрабіць знак крыжа над кім-небудзь, чым-небудзь.
**В.** Пераноснае значэнне: даць каму-небудзь, чаму-небудзь імя, назву, мянушку.

*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы ў пяці тамах,* т.1, Мінск 1977, с.309.

**Заданне 4. (0–1)**

| 4. |
|---|
| 0–1 |
| |

**Дапасуй па адным з прыведзеных пытанняў да канкрэтных абзацаў з тэксту, якія адказваюць на іх. Літарныя абазначэнні пытанняў упішы ў табліцу насупраць нумароў абзацаў.**

*а) Які сэнс мае выраз “кніжны чарвяк”?*
*б) Якімі спосабамі людзі змагаліся з насякомымі ў кнігах у розныя часы?*
*в) На якія тыпы кніжных чарвякоў можна падзяліць людзей?*
*г) Па якіх прыкметах можна зразумець, што чалавек – кніжны чарвяк?*
*д) Як называюцца ў розных мовах насякомыя, якія псуюць кнігі?*

| Абзац | Пытанне |
|---|---|
| 1 | |
| 2 | |
| 5 | |

**Заданне 5. (0–2)**

| 5. |
|---|
| 0–1–2 |
| |

**Да кожнага з прыведзеных ніжэй слоў падбяры антонім.**

браць – ..........................................................................................

сыты – ..........................................................................................

staноўчы – ..........................................................................................

**Заданне 6. (0–1)**

| 6. |
|---|
| 0–1 |
| |

**Сфармулюй галоўную думку чацвёртага абзаца.**

..........................................................................................

..........................................................................................

..........................................................................................

**Заданне 7. (0–1)**

| 7. |
|---|
| 0–1 |
| |

**Якую функцыю выконваюць пытанні ў першым абзацы? Свой адказ абгрунтуй.**

..........................................................................................

..........................................................................................

..........................................................................................

8.
0–1

**Заданне 8. (0–1)**
**Растлумач значэнне выдзеленага фразеалагізма ў прыведзеным ніжэй сказе з пятага абзаца.**

Але як пазбавіцца ад таго, што так складана заўважыць **няўзброеным вокам**?

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

.......................................................................................................................

## Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów

**Заданне 9. (0–2)**
**Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент верша Францішка Багушэвіча.**

Францішак Багушэвіч
***Калыханка***

Люлі, сынок, люлі, люлі!
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі;
А ты чаго не спіш, сынку,
Як бы чуў ліху гадзінку?
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
А як матка прыйдзе ў госці,
Ой, то будзе ёй радосці... [...]
Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў Божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад Бога.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Тагды матка прыйдзе ў госці,
Сын выкіне стары косці,
Жабруючы, пойдзе ў вёску,
Будзе прасіць Матку Боску,
Каб забыцца ей аб сыне,
Каб не ведаць, гдзе ён згіне.
Люлі, сынок, люлі, люлі...
Бо ўжо курачкі паснулі.
Ой, не будзь ты лепей панам,

Ні вялікім капітанам,
Будзь, чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала...
Люлі, сынок, люлі, люлі.
Усе курачкі паснулі,
Ой, паснулі і курчаткі
Пад скрыдэлкам сваей маткі...

Ф. Багушэвіч, *Творы*, Мінск 1991, с. 74–75.

**Падай дзве рысы паэтыкі рэалізму, якія прысутнічаюць у прыведзеным вершы.**

| 9. |
| --- |
| 0–1–2 |
| |

1. ..............................................................................................................................................

2. ...............................................................................................................................................

## Заданне 10. (0–1)

| 10. |
| --- |
| 0–1 |
| |

**Да якой жанравай разнавіднасці лірыкі адносіцца верш Францішка Багушэвіча *Калыханка*? Выберы правільны адказ сярод А–Г.**

**А.** філасофская
**Б.** грамадзянская
**В.** інтымная
**Г.** рэлігійная

## Заданне 11. (0–1)

| 11. |
| --- |
| 0–1 |
| |

**Прывядзі яшчэ адзін твор беларускай літаратуры, у якім выступае матыў вырачэння бацькоў. Падай загаловак і прозвішча аўтара.**

Загаловак: .......................................... Аўтар: .........................................................................

## Заданне 12. (0–1)

**Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент *Апокрыфа* Максіма Багдановіча.**

1. Ад Максіма Кніжніка пачатак...
2. І калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос ізноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым сведчылі пракокі. [...]
4. І разам з ім святы Пётра і святы Юр’я. Але ніхто з людзей не пазнаваў Яго. […]
7. Толькі музыка, катораму цяпер не было чаго рабіць, падышоў да іх і сказаў: сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек.
8. І сказаў яму Хрыстос: не смуціся ў сэрцы сваім. Ці ж не твае песні спяваюць яны цяпер, у часе жніва! Таму не схіляй нізка галавы твае, і не хавай аблічча ад вачэй людскіх. […]

13. Так навучаў Хрыстос музыку. Але Пётра, пачуўшы словы яго, сказаў: Вучыцелю, у гэтай краіне ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца таго чалавека, каторы, шукаючы скарынкі хлеба, прыйдзе з песняй да іх?
14. У адпаведнасці яму, сказаў Хрыстос: так, жыццё гэтых людзей цяжкое, беднае і прыгнечанае. Чаму ж ты хочаш яшчэ пазбавіць іх красы! Мала дадзена ім – няўжо ж трэба, каб было яшчэ менш?
15. І, абярнуўшы аблічча сваё да музыкі, папытаўся: калі пяюць песні ў вас?
16. Музыка адказаў: пяюць на Каляды, на Запускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках. […]
18. І мовіў Хрыстос Пятру: ты, шкадуючы галодных людзей, асудзіў песню, але самі галодныя не асудзілі яе. Жывая яшчэ душа ў народзе гэтым.
19. Тады ізноў сказаў Пётра: але няхай жа ў песнях будзе страва для душы, няхай будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы быў у іх і спажытак чалавеку.
20. І адказаў яму Хрыстос: няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы.

knihi.com

12. 0–1

**На падставе фрагмента і ўсяго твора сфармулюй галоўную думку апавядання.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

13. 0–1

**Заданне 13. (0–1)**

**Які стылістычны сродак выдзелены ў прыведзеным ніжэй радку з *Апокрыфа* Максіма Багдановіча? Пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

Тады ізноў сказаў Пётра: але няхай жа ў песнях будзе **страва для душы**, няхай будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы быў у іх і спажытак чалавеку.

**А.** метафара
**Б.** эпітэт
**В.** параўнанне
**Г.** метанімія

**Заданне 14. (0–1)**

14. 0–1

**Працягні сказ. Пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

Музы́ка з’яўляецца адным з галоўных герояў твора

**А.** *На калядах к сыну* Змітрака Бядулі.
**Б.** *Новая зямля* Якуба Коласа.
**В.** *Курган* Янкі Купалы.
**Г.** *Пінская шляхта* Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

**Заданне 15. (0–2)**

15. 0–1–2

**Акрэслі жанр кожнага твора. Літарныя абазначэнні жанраў А– Г упішы ў табліцу насупраць загалоўкаў твораў.**

**А.** паэма
**Б.** апавяданне
**В.** раман
**Г.** камедыя

| | | |
|---|---|---|
| **1.** | Змітрок Бядуля, *На калядах к сыну* | |
| **2.** | Іван Мележ, *Людзі на балоце* | |
| **3.** | Янка Купала, *Курган* | |

**Заданне 16. (0–1)**

**Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент паэмы *Курган* Янкі Купалы.**

Акалічны народ гуслі знаў гусляра;
Песня-дума за сэрца хапала;
Вакол гэтай думы дудара-званара
Казак дзіўных зләжылась нямала.

Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён
Па струнах з неадступнаю песняй, –
Сон злятае з павек, болю ціпшыцца стогн,
Не шумяць ясакары, чарэсні; [...]

Вось настроіў, навёў тон у струнах як след,
Не зірнуўшы на гулі ні разу,
І сядзіць гэты **сумны, як лунь**, белы дзед,
І чакае ад князя прыказу.

Янка Купала, *Курган*, knihi.com

16.
0–1

**Сярод варыянтаў А–Г выберы і пазнач той, дзе правільна названы выдзелены ў фрагменце троп.**

**А.** метафара
**Б.** гіпербала
**В.** параўнанне
**Г.** супрацьпастаўленне

17.
0–30

**Заданне 17. (0–30)**

**Część 3. Wypracowanie**

Выберы **адну** з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.

- У сачыненні паразважай над **праблемай**, зададзенай у тэме. Выкладзі **сваю думку** і **абгрунтуй** яе.
- У развагах прадстаў **аргументы**, спасылаючыся на **літаратурны твор**, згаданы ў тэме, і на **іншы твор беларускай літаратуры**.
- Твая праца павінна складацца не менш чым з **250 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.

Тэма 1. (0–30)

**Чаму любові да Радзімы прысвечана так шмат літаратурных твораў? Паразважай над пытаннем на падставе верша Ларысы Геніюш *** [Маці мая сялянская] і выбранага твора беларускай літаратуры.**

Ларыса Геніюш

***

Маці мая сялянская,
маці мая славянская,
ветлівая, гасцінная,
ў крыўдзе чужой
непавінная.
Ураджайная і зялёная,
хлебам слаўная ад вякоў,
неспакойная, неўгамонная
ды бунтарская ў жылах кроў.

Гаспадарыла
ды батрачыла –
намагалася за дваіх.
Не хачу я чужое
мачыхі
аглядаць
на слядох тваіх!

Ты мой боль круты,
ты мой шлях святы,
сцежка верная ў цішыне.
Ўсё мне дорага,
што прыдбала ты
працай, сілаю
для мяне.

Ты – як праўда праўд,
ўсюды свой і брат,
мовы роднае
звонкі дар,
Ты мой шлях круты,
ты мой боль святы,
Беларусь мая,
мой алтар.

Ларыса Геніюш, ****Маці мая сялянская****, rv-blr.com

Тэма 2. (0–30)

**Адзінота як чалавечы досвед. Паразважай над тэмай, спасылаючыся на вядомыя табе фрагменты твора *Вечар* Аляксея Дударава і выбраны твор беларускай літаратуры.**

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr**

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

| Miejsce dla egzaminatora | | Miejsce dla egzaminatora |
|---|---|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | | *Jeżeli **0 pkt** – wskaż powód.* | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | 0 | 1 | *Brak lektury obowiązkowej.* | *Nie dotyczy problemu.* | *Nie jest wypowiedzią argumentacyjną.* |

| | | | | | | | | | | | *Liczba błędów rzeczowych* | ***OGÓŁEM KLiK*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | | |
| | | 9 | 10 | 11 | 12 | | | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **3a** | **Struktura wypowiedzi** | 0 | 1 | 2 | 3 |
| | | G | F | E | C |
| | | | D | B | |

| | | *Liczba błędów w spójności* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **3b** | **Spójność wypowiedzi** | | 0 | 1 | 2 | 3 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **3c** | **Styl wypowiedzi** | 0 | 1 |

| | | *Liczba błędów językowych* | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **4a** | **Zakres i poprawność środków językowych** | | 0 | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| | | | 1G, 2F, 3E, 2G, 3F, 3G | 1F, 2E, 3D | 1E, 2D, 3C | 1D, 2C, 3B | 1C, 2B, 3A | 1B, 2A | 1A |

| | | *Liczba błędów ortograficznych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4b** | **Poprawność ortograficzna** | | 0 | 1 | 2 |

| | | *Liczba błędów interpunkcyjnych* | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **4c** | **Poprawność interpunkcyjna** | | 0 | 1 | 2 |

**Łączna liczba punktów: ……………………**

**BRUDNOPIS** ***(nie podlega ocenie)***

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*


# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*

# JĘZYK BIAŁORUSKI

## Poziom podstawowy

*Formuła 2023*